## 10. ПЕСНЯРЫ

Не аднаго мяне цягне на сваю паляну. Беларусы, можна сказаць, -- усе паляне, выхадцы з палян, куды іх сёння гоніць генетычная памяць. Хочаце паназіраць за сабой?

Сённяшні тыповы беларус жыве ў гарадскім мікрараёне. Побач з дзвяціпавярховымі панельнымі каробкамі -– саснова-бярозавы лясок. Да яго пратаптаны шматлікія сцежкі -– быццам прайшоў статак кароў (каровы, успомніце, ходзяць адна за другой і пратопваюць глыбокія сцежкі). Так напрамкі ходзяць на прыроду беларусы. Як толькі дачакаюцца суботы, іх цягне на лясную паляну (у каго няма дачы).

Хто там ідзе па пыльнай сцежцы?

Тыповаму беларусу гадоў трыццаць пяць, і нешта ён худаваты, хваравіта-счарнелы тварам, і чамусьці вусаты, як каўказец (наконт вусоў, якія сучасным беларускім мужчынам не ідуць, вылучаю гіпотэзу: адчуваючы сваю непоўнавартаснасць, мужчыны-беларусы ўзнімаюць сябе ва ўласных вачах пры дапамозе вусоў і барады). Тыповая беларусачка, жонка, ідзе след у след, канчаткова заганяе на той свет траву сваёй нагой і вагой (наконт вагі беларусачкі гіпотэзу выкажу крыху ніжэй).

Ён і яна нясуць па торбе. За імі бягуць іх тыповыя дзеці, хлопчык і дзяўчынка (большасць гарадскіх пар, выконваючы парады вясковых бацькоў, заводзяць па два дзіцяці).

Паралельна, па сваіх сцежках, у тым жа напрамку, ад шэрых каробак да зялёнага лесу, ідуць і ідуць іншыя сем'і. Выхадная субота яднае беларусаў у большай ступені, чым працоўныя будні.

Лес сустракае іх па-лясному: цішынёй, пахам грыбніцы і хвоі, настройвае на роздум, на вечнасць, на памяць аб мінулым.

Але назірайце, як неадэкватна паводзіць сябе беларус у прыгарадным лесе, на лясной паляне. Ён быццам вар'яцее. З торбы дастае магнітафон, ставіць на паляну, уключае на поўную моц, забівае галасы ўсіх птушак. Дастае сякеру, ідзе да бліжэйшай хвоечкі (ці бярозкі) –- і гак-гак-гак у такт магнітафоннай папсе.

Тыя ж гукі даносяцца з суседніх палян. Кожная сям'я ладзіць уласнае вогнішча, каб засмажыць індывідуальны шашлык –- і тым падняць сябе ва ўласных вачах.

Дым завалаквае лес. Не паглядзець лесу ў вочы. Чуецца, як у дыме кашляе і мацюкаецца мужчына, як шчасліва вішчаць дзеці, як жанчына сіліцца перакрычаць магнітафон, мацюкі, кашаль, дзяцей:

--Саша! Цыбуля канчаецца. Трэба ехаць у дзярэўню!

У шызым дыме, над зняважаным лесам, гучыць самае сучаснае, саме тыповае, самае народнае, самае немілагучнае слова Беларусі: ДЗЯРЭЎНЯ.

Ад Брэста да Магілёва, ад Полацка да Турава, ад дублёнкі да куфайкі, ад Дзямянцея да Лукашэнкі, ад катэджа да хаціны, ад міністра да

прыбіральшчыцы, ад тралейбуса да "мерсэдэса", ад дыктара да гледача, ад сесіі парламента да п'янкі-прэзентацыі, ад вёскі да горада, ад паляны да паляны ляціць усебеларускі пароль: "дзярэўня".

Не рускае і не беларускае, не польскае і не цюркскае, не яўрэйскае і не японскае –– гэтае слова-сімвал аб'яднала народ моўным бескультур'ем, нежаданнем самаўдасканалення.

Радзіма-маці, пакутніца-паланянка, ты не канчала лінгвістычных універсітэтаў, ты не вінаватая, што дзеля самазахавання падладзілася пад чужынцаў мовай-трасянкай, якую пачулі ад цябе твае дзеці. Але ж зараз, радзіма, ты маеш незалежнасць, таму маеш права ткнуць носам сваіх лянівых дзяцей у дысананас "дзярэўня", як у дзярмо. Няўжо не сцямяць відавочную навуку?

Бачу: не сцямяць. Бо прыгарадны лес, чую, запаланіла п'яная гамана. Беларусы на сваіх палянах выпілі гарэлкі, з'елі шашлыкі, іх пацягнула пасьпяваць. Усе паляны з'яднала ідзіная песня.

Якую песню спявае падпіты беларус у горадзе і ў дзярэўні, на паляне і на вяселлі? Вы ведаеце: ён спявае аб тым, як касіў Ясь канюшыну, а дзяўчына жыта жала ды на Яся паглядала.

Гэта пяе ў Беларусі, без перабольшання, кожны, нават той, каму мядзведзь наступіў на вуха. Не праспявае, дык пракрычыць, настолькі спрошчана мелодыя.

Усенароднай песню зрабіў Уладзімір Мулявін, надаўшы ёй прымітыўна-ударную рытміку. У папсовай рытміцы чуюцца ўдары той сякеры, якая толькі што валіла лес для чарговай выпіўкі беларуса ля вогнішча, пасля якога на паляне не расце трава.

Кінуў Яська касіць, пайшоў маці прасіць… Гак, гак, гак! У вас не сціскаецца сэрца ад незваротнай страты, калі па галаве б'е гэты знішчальны рытм? Вам ніколі не здавалася, што "Песняры" ў нечым, самым існым, вас падманваюць? Што беларускую песню яны не пяюць душой, а толькі прафесійна пастаўленымі галасавымі звязкамі, якім без розніцы, якое слова трапляе на іх — беларускае, нямецкае, грузінскае?

Народ, які ведае толькі адну народную песню, напэўна, у глыбіні душы адчувае сорам і няпоўнацэннасць, у выніку чаго ставіцца з павагай да Мулявіна, які вывучыў іх некалькі дзесяткаў. Толькі гэтай акалічнасцю я магу растлумачыць папулярнасць "Песняроў" на радзіме ў самым пачатку іх узлёту.

Апошнія два дзесяцігоддзі, адзначым, "Песняры" існуюць галоўным чынам як гастралёры па-за межамі Беларусі. Дома адносяцца да іх стрымана: пяюць –– ну і добра. У чужых краінах ім пляскаюць у ладкі, як вясёлай рускай экзотыцы, як настальгіі, як народнаму кічу. А дома, у Беларусі, людзі нарэшце зразумелі іх кан'юнктурную сутнасць, асабліва, калі пасля трагічнай смерці Мулявіна "Песняры" пачалі грызціся, дзяліцца і памнажацца.

Мулявінскі ансамбль многа зрабіў, каб нацыя не забыла свае песні. Застольны шлягер пра Яся і канюшыну хутка ўводзіць чалавека ў стан трансу. Пра дзяўчыну, якую не ўсадзіш на ўсю лаву, з асаблівым смакам гарланяць ідэнтычныя па аб'ёму кабеты.

Калі б беларускія кабеты былі не такія мажныя, то іх п’яныя мужы начавалі б не ва ўласных спальнях, а на лясных палянах, каля астываючых кастроў, і нацыя вымерла б ад недароду. А калі б беларускія мужчыны не былі такія худыя і лёгкія, то жанкі не змаглі б узваліць іх на сябе і прынесці з паляны ў спальню.

Так размнажаюцца песняры.

1995-2005

www.kamunikat.org